Гамяльчука аштрафавалі за сувенірны сцяжок на балконе

14.11.2021



Міхаіл Латышаў

51-гадовага **Міхаіла Латышава** затрымалі 26 кастрычніка. Ноч ён правёў у ізалятары, а на наступны дзень суддзя Савецкага суду **Лагуновіч** пакараў яго штрафам 580 рублёў па арт. 24.23 КаАП РБ (Парушэнне парадку правядзення масавых мерапрыемстваў) за пікетаванне. Віны сваёй **Латышаў** не прызнаў. Мужчына ў судзе цвердзіў, што аніякага пікету ён не ладзіў.

27 кастрычніка раніцою **Латышаў** выйшаў з шматкватэрнага дому, сустрэў суседа, сталі размаўляць. Падчас размовы Міхаіл убачыў як два чалавекі фатаграфуюць яго балкон.

> *«Я здзівіўся таму, што яны фатаграфуюць мой балкон, – распавядае Міхаіл, – але потым зразумеў, што іх увагу прыцягнуў наш гістарычны сцяг бчб з Пагоняй. Я да іх падышоў і сказаў, каб фатаграфавалі мяне, бо я гаспадар кватэры. Яны сказалі што з міліцыі. На маю просьбу паказалі сваё пасведчанне і загадалі ехаць з імі. Гэта былі аператыўнікі. Мы прыехалі ў аддзел, яны мяне пачалі пытаць чаго я павесіў сцяг. Я адказаў, што сцяг наш, гістарычны. Ён ужо вісіць там 7 гадоў – маленькі, сувенірны сцяжок».*

Латышаў патлумачыў паходжанне сцяга і паабяцаў яго зняць. Але супрацоўнікі настойвалі на тым, каб паехаць да яго дадому і ўласнаручна яго зняць. У выніку пасля непрацяглай дыскусіі **Латышаў** з сілавікамі паехалі да яго дадому, знялі сцяг і вярнуліся ў аддзел. Супрацоўнік Савецкага АУСу капітан **Дзмітрый Акуліч** склаў на **Латышава** пратакол аб адміністратыўным правапарушэнні па арт. 24.23 КаАП РБ. Міхаіл адмовіўся яго падпісвць, бо быў абсалютна не згодны з тым, што там было напісана.

Увечары мужчыну змясцілі ў ІЧУ (Ізалятар часовага ўтрымання). На наступны дзень адбыўся суд у судзе Савецкага раёну.


МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Травень 2021

СВАБОДА СХОДАЎ

- Тры гады "хатняй хіміі" — за знаходжанне на праспекце і парушэнне працы "Мінсктранса"
- Дзяржабвінавачанне запрасіла два гады калоніі для палітвязня Івана Багдзевіча
- Што адбывалася ў судах па адміністрацыйных справах цягам тыдня?
- Ці можна трапіць у калонію, калі своечасова не зняў бчб-сняжынкі з акна? Юрыст расказвае пра змены ў Крымінальным кодэксе


СМЯРОТНАЕ ПАКАРАННЕ



- Сястра асуджанага да смяротнага пакарання Віктара Паўлава: "Яго хутчэй за ўсё расстралялі"
- Андрэй Палуда: "Пакуль няма сістэмных зменаў, новыя прысуды і расстрэлы могуць адбыцца ў любы момант"
- Вярхоўны суд не задаволіў апеляцыйную скаргу асуджанага да смяротнага пакарання Віктара Скрундзіка
- Асуджаных да смерці братоў Косцевых памілавалі

«Гэта не быў пратэст ці пікет, – тлумачыў у судзе Міхаіл, – а павага да нашай гістарычнай спадчыны».

Суддзя **Лагуновіч** даў Латышаву 20 базавых штрафу.



«Вельмі прыкра тое, што наш бчб сцяг стаў разменнай манета ў барацьбе за ўладу на фоне пратэстаў 2020 года, – кажа Міхаіл. – Ні беларускім уладам, ні беларускаму народу гэта не патрэбна. Нашыя гістарычныя сімвалы павінны аб'ядноўваць людзей, а не станавіцца прычынай ўнутрыграмадскага супрацьстаяння. Вельмі брудная і брыдкая сітуацыя і справа».

Латышаў не збіраецца абскарджваць рашэнне раённага суду, бо не верыць у беларускае правасуддзе.

Яго тэлефон, канфіскаваны ў міліцыі, застаецца ў закладзе да таго часу пакуль Міхаіл не сплаціць штраф.

Мужчына робіць візу ў Польшчу і марыць жыць і працаваць там, дзе не штрафуюць і садзяць у турму за ўпадабайкі, каментары ці гістарычныя сімвалы.

Аўтар **Ларыса Шчыракова**

Фота аўтара

Гомельская вясна

ВІДЭА

БЛОГІ



ЛЕАНІД СУДАЛЕНКА

ЯК Я НЕ СТАЎ УДЗЕЛЬНІКАМ НАРОДНАГА “ХУРАЛА” ЦІ ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ!



ЛАРЫСА ШЧЫРАКОВА

Як прайшла спецаперацыя ГУБАЗіК па пошуку брудных майткоў у журналісткі ці кароткая гісторыя аднага пратрусу

НАВІНЫ ПАРТНЁРАЎ

07.04.2023 Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі тэрмін па крымінальнай справе «Вясна»

23.03.2023 Зняў двух п'яных расейскіх вайскоўцаў – трапіў пад пераслед, але здолеў збегчы радыё «Свабода»

07.03.2023 Ксенія Луцкіна перахварэла ў калоніі на двухбаковую пнеўманію «Народная воля»

02.03.2023 У палітзняволенай журналісткі Ірыны Слаўнікавай істотна пагоршыўся зрок БАЖ

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА Ў СВЕЦЕ


08.08.2022 Пошта ЗША спыніла адпраўленні ў Беларусь


26.07.2022 «Інфармацыя пра маё затрыманне нават мяне шакавала»: ураджэнца Гомельшчыны ўжо тры месяцы трымаюць у ІЧУ ў Расеі


23.07.2022 У Польшчы знік 18-гадовы хлопец з Калінкавічаў

14.07.2022 У Кіеве заявілі аб імавернасці ўзброеных правакацый у памежных з Украінай раёнах Гомельшчыны і Берасцейшчыны

САЦЫЯЛЬНЫЯ СЕТКІ







ПАРТНЁРЫ

Радыё Свабода · Народная Воля · ВЯСНА праваабарончы цэнтр · kamunikat · Наша Ніва · Белорусский документационный центр · Центр стратегической тяжбы

Праваабарончыя сайты: Брэст Віцебск Гародня Магілёў

© 2023 Гомельская вясна

stryzhakandrej@gmail.com | sutiajnik@gmail.com